Комуністычная партыя (большэвікоў) Беларусі

# Калгаснік Копыльшчыны

№ 12 (1765) Пятница 17 сакавика 1944 г.

Орган Копыльскага РК КП(б)Б.

**Смерць нямецкім акупантам!**

**Нэ з'яуляйцеся на зборныя пункты па набору у фашысцкую „краявую абарону"! Пры паяуленни гитлерауцау неадкладна паведамляйце аб гэтым партызанам и сами скрывайцеся. Адзиночак и невяликия групы фашыстау—знишчайце!**

## ГАНЕБНА ЗАГИНЕ ТОЙ, ХТО ПОЙДЗЕ У „КРАЯВУЮ АБАРОНУ"

Чырвоная Армия усё новыми сакрушальными ударами прыближае канчатковы разгром гитлерауских разбойницких банд. Грандыёзныя битвы на Украине сведчаць аб гэтым. Сила ударау нашых доблесных воинау такая вялиская, што фрицы без памяци бягуць з украинскай зямли, кидаючы адразу па 500 танкау и 600 гармат, як гэта было пад Уманю. Здань Сталинграда праследуе немцау. Пад Никалаевым акружана и знишчана новая буйная група нямецка-фашысцких войск.

Немцы прадчуваюць, што скора им прыдзецца падмазаць пяты и на Беларуси, яны прадчуваюць сваю хутную гибель. Для таго, каб прадоужыць свеё існаванне, гитлерауския бандыты кидаюцца на самыя наглыя правакацыи и злачынствы. Яны сфабрыкавали нейкую смехатворную „беларускую центральную раду" и не празы даюць, каб цераз их пасрэдництва знишчыць варожы им беларуски народ.

Нямецки прыхвасцень, „президэнт" Астроуски, 6 сакавика падписау прадыктаваны яму загад, яким ён адкрыта прадае беларуских людзей фашысцким катам. Гэты манеур прадажныя сабаки хочуць правесци пад шырмай стварэння „беларускай краявой абароны". Яны хочуць заставиць беларусау забиваць свaих-жа братоу и сёстрау, праливаць кроу народную для таго, каб на лишнюю гадзину адцягнуць смерць фашызма.

Для ажыццяулення сваих крывавых планау фашысцкия абманшчыки цяпер, як николи, крычаць аб „сяброустве" з беларуским народам, выдумляюць самыя прыгожыя прамовы дя розныя абяцанки. Але дарэмны усе их патуги ашукаць свядомых беларуских людзей. Наш народ ужо добра вывучыу звярыную натуру фашыста, и, з агидай слухаючы яго брахню, робиць свой вывад—бязлитасна помсциць фашысцкаму зверу!

Хиба-ж могуць забыць працоуныя Копыльшчыны аб 9,5 тысячах нявинных мужчын и жанчын, старыкоу и дзяцей—павешаных, замучаных, спаленых жывыми и расстраляных нямецкими акупантами за час их гаспадарання у нашым раёне.

Яшчэ не застылы на роднай зямли слёзы и кроу замучаных, а звярыныя апетыты фашысцких гадау прагнуць новых ахвяр. Немцы и их халуи выдумляюць новыя повады и правакацыи для знишчэння беларускага народа. З гэтых правакацый самай наглай и крывавай з'яуляецца арганизацыя так званай „беларускай краявой абароны". И той, хто пайдзе у гэту фашысцкую „краявую абарону", той станэ здрадникам свайго народа, сваей Радзимы и загине ганебнай смерцю.

**Працоуныя Копыльшчыны!**

Усими сродками зрывайце крывавыя фашысцкия планы знишчэння беларускага народа! Дапамагайце партызанам выкрываць и знишчаць фашысцких агентау, шпиёнау, разносчыкау загадау Астроускага и павестак па мабилизацыи. Мужчыны! Ни адзин не идзице на зборныя пункты! Будзьце пильными, каб вас не захапили гитлерауцы у расплох.

Працоуныя раёна! Партызаны и партызанки! Напружым усе силы, дапаможам Чырвонай Армии дабиць смяротна раненага фашысцкага звера!

## Мы не здрадзим народу

**Рэзалюцыя, аднадушна прынятая сходам сялян вески С.**

Пачуцце лютай ненависци ахапила нас, калі мы даведалися аб новай, яшчэ нечуванай у гисторыи, здрадзе. Нямецки халуй Астроуски сваим загадам ад 6 сакавика 1944 года адкрыта прадае беларуски народ нямецким разбойникам. Гэты прадажны сабака хоча ператварыць беларусау у гарматнае мяса для германскай армии, якая стаиць на краи гибели.

Гитлерауския заправилы и их халуи з шайки „беларускай центральнай рады" кидаюцца у крайнасць. З мэтай прадоужыць сваё иснаванне, яны хочуць заставиць беларусау праливаць сваю кроу и кроу сваих близких у их интарэсах, яны хочуць зрабиць нас такими-ж, як и яны, забойцами сваих братоу и сёстрау. Але не выйдзе гэты фашысцки манеур! Ни адзин з нас не пойдзе у „краявую абарону". И к гэтаму мы закликаем усих беларуских людзей. Няхай мы загинем у святой барацьбе з заклятым ворагам, але мы не будзем здраднiками и катами свайго народа.

## Тысячы людзей асуджаны на смерць

На станцыи Ганцавичы у лагеры пакутуюць тысячы беларуских юнакоу и дзяучат Копыльскага, Слуцкага, Краснаслабодскага и других раёнау. Моладзь немцы брали для адпраукi на „работу у Германию". Расказы видавочцау и нелегальна пераданыя письма з лагера сведчаць, што людзи там жывуць на правах палонных и нават горш. Им не даюць ни работы, ни харчавання. Тысячы людзей асуджаны на галодную и халодную смерць.

Л. А.

# НА ФРАНТАХ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ

(Агляд ваенных дзеянняу за час з 10 па 16 сакавика).

Нашы войски на Украине развивали паспяховае наступленне и нанесли працуунику рад цяжких страт.

Войски 3-га Украинскага фронта 13 сакавика авалодали горадам Херсон—важным апорным пунктам у низоуи Днепра. За час з 6 па 12 сакавика войски фронта знишчыли 20.000 и узяли у палон звыш 2.560 нямецких салдат и афицэрау, захапили 87 танкау, 60 самаходных гармат, 338 палявых гармат, 142 минамёты, 1077 кулямётау, 8200 винтовак и аутаматау, 48 бронемашын и бронетранспарцёрау, 121 трактар и цягач, 5342 аутамашыны, 27 паравозау, 242 вагоны и 63 розных складау.

Войски 2-га украинскага фронта прарвали абарону немцау и разграмили Уманьска-Хрысцинаускую групроуку працуцника у саставе адной артылерыйскай, 6 танкавых, 7 пяхотных дывизий. За 5 дзён наступальных баёу совецкия часци знишчыли звыш 20.000 нямецких салдат и афицэрау, узяли больш 2.500 палонных, захапили звыш 600 танкау и самаходных гармат, з их больш 200 поунасцю спраyных „Тыграу", „Пантэр" и „Фердынандау". 600 палявых гармат, звыш 12600 аутамашын, больш 50 складау з узбраеннем, боепрыпасами и другой ваеннай маёмасцю.

Па паказаннях палонных, захопленая матар'яльная частка належала 11, 13, 14, 16, 17 нямецким танкавым дывизиям и танкавай дывизии СС „Адольф Гитлер", якия павинны были астанавиць наступленне совецких войск. Аднак, пад ударами совецких падвижных злучэнняу и пяхоты, немцы были вымушаны кинуць усю сваю баявую тэхнику и уцякаць.

Байцы и афицэры Чырвонай Армии праявили у гэтых баях найвялики гераизм и мужнасць. Ва умовах поунага бездарожжа и непралазнай грязи совецкая пяхота на асобных напрамках з баями праходзила за сутки па 20-30 километрау.

Войски 3-га Украинскага фронта на Никалаеуским напрамку у раёне населеных пунктау Берязнегаватае—Сингироука акружыли и знишчыли буйную групироуку немцау у саставе некальких дывизий. Захоплена вяликая колькасць трафеяу и многа палонных. Тольки пры спробе вырвацца з акружэння працууник страциу да 10.000 забитыми и звыш 4000 палонных сваих салдат и афицэрау.

На паудзёвы захад ад Умани войски 2-га Украинскага фронта паспяхова фарсиравали раку Паудзёвы Буг на 100 клм. па фронту и, зламаушы супрациуленне працуника на правым беразе раки, прасунулися уперад ад 20 да 30 клм.

Войски 2-га Украинскага фронта, развиваючы наступленне, авалодали буйным чыгуначным вузлом и горадам Ваппярка, перарэзаушы, такім чынам, важнейшую чыгуначную магистраль Жмерынка—Одэса. Войсками фронта пры гэтым захоплены трафеи: паравозау—12, вагонау—500, эшалонау з ваеннай маёмасцю—2, аутамашын—1300, вялікия артылерыйские склады и многа иншай ваеннай маёмасци, падлик якой працягваецца.

За прайшоушыя 7 дзён нашы войски на Украине вызвалили ад нямецка-фашысцких захопникау горад Умань, чыгуначныя вузлы Хрысцинаука, Далинзкая и Калинаука, гарады Шырокая Балка (на пауночным беразе Днепроускага Лимана), Бэршадзь, Трасцянец, Немирау, Бабрынец, а таксама 53 раённыя цэнтры Тарнопальскай, Каменец-Падольскай, Винницкай, Киеускай, Кираваградскай, Никалаеускай и Одэскай абласцей.

На працягу з 9 па 15 сакавика нашыми войскамі на усих франтах падбита и знишчана 485 танкау. У паветраных баях и агнём зенитнай артылерыи збит 231 самалёт працуника.

# МИЖНАРОДНЫ АГЛЯД

Бліскучыя перамоги Ч
ровай Армии натхняюць
барацьбу заняволеныя гіт
рауцами народы.

Аб узмацненни парты
скай барацьбы паведамляе
з Францыи. У гарах Верх
Савойи адбываюцца
памиж французскими пат
тами и карными атрад
немцау и их прыслужник
Аб мужнасци народ
мсцицау Францыи с
чыць наступны выпадак.

У адной з вёсак облас
Вар 9 французских парты
многа гадзин вяли бой з
гитлерауцами и знишчыли
немцау.

У пауночных раёнах І
лии, занятых немцами,
тые 6 мильёнау рабоч
Побач з гэтым атрады ита
льских партызан вядуць
прымиримую барацьбу с
роць гитлерауских акуп
тау и итальянских фаш
тау. Партызанами у снеж
месяцы минулага года те
ки у адным раёне гор
Бьелла праведзена 63 апе
цыи. Были праведзены на
ды на 17 казарм фашы
ких карабинерау, на 7 за
дау и разгромлена рэдакц
фашысцкай газетки „Биелл

У Ламбардыи партыза
правили 56 аперацый, у
дзе яких знишчана 150 н
цау и 40 итальянских фаш
тау. Знишчана таксама
кальки складау узбраення
узарвана 1 электраст
цыя. У лютым гитлерау
прадпрынялі карную экс
дыцыю супроць партыза
Пьемонта. Карники увяли
дзеянне танки. Партыза
паспяхова адбили напа
знишчыушы 3 танки и
гитлерауцау.

У Югаславии часци нар
на-вызваленчай армии уме
и мужна змагаюцца за выз
ленне радзимы. Яны нан
ли немцам паражэнне
участку фронта памиж З
рэбам и Карловацэм. Ля
рада Травника партыза
разграмили нямецкую ка
ну. Ва Усходняй Босниі п
тызаны перарвали важн
чыгуначную линию пам
Сараева и Вышэградам.

РЭДКАЛЕГИЯ